Падтрымай "Вясну" на PATREON

Гомельскі гарвыканкам забараніў вулічнае шэсце

25.09.2015 **Тэгі**: выбары-2015, свабода мірных сходаў



Гомельскі гарвыканкам.

Праваабаронцы Анатоль Паплаўны, Віктар Казлоў і Леанід Судаленка з Гомеля замовілі на 27 верасня вулічнае шэсце, падчас якога планавалі інфармаванне выбаршчыкаў аб праве кожнага адмовіцца ад удзелу ў выбарах і не ісці на датэрміновае галасаванне. Аднак гарвыканкам ня даў дазволу на правядзенне шэсця.

У адмове намеснік старшыні гарвыканкаму Аксана Рудзянок спаслалася на тое, што заяўнікі ня выканалі патрабавання, замацаванага ў рашэнні №775: не заключылі дамовы з паліклінікай

і спецаўтапрадпрыемствам на абслугоўванне мерапрыемства. Да таго ж праваабаронцы замовілі вулічнае шэсце па вуліцы Савецкай у цэнтры гораду па маршруту якога знаходзяцца “будынкі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, а таксама рэдакцыі тэлевізійных і радыёвяшчальных сродкаў масавай інфармацыі”, што, на - думку чыноўнікаў, забаронена законам.

Як паведаміў праваабаронца і юрыст **Леанід Судаленка**, адмову гарвыканкаму заяўнікі наважаны абскардзіць у судзе.

Трэба адзначыць, што ў Гомелі за апошнія 10 гадоў улады не дазволілі правесці ніводнага масавага мерапрыемства, якія былі заяўлены прадстаўнікамі дэмакратычнай супольнасці. Абскарджванне такіх рашэнняў у судах не прыносіць плёну. Адзінай магчымасцю даказаць парушэнне права з’яўляецца Камітэт ААН па правах чалавека, які ўжо некалькі разоў прымаў рашэнні аб парушэннях правоў на мірныя сходы ў Гомелі.

Негледзячы на гэта, чыноўнікі па-ранейшаму забараняюць грамадзянам публічна выказаць свае меркаванні.

Гомельская Вясна

Твитнуть







кветкамі і шарыкамі

"Беларусі пахваліцца няма чым". У Вене прайшла кансультацыя пра мірныя пратэсты

Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Памёр палітзняволены мастак Алесь Пушкін (дапоўнена)

"Рэжымныя аб'екты — залатое дно". Былы палітвязень і юрыст "Вясны" — пра прамзону ў калоніі № 17

"Гэта бессэнсоўны акт прапаганды". Былы палітвязень ПК-17 пра сюжэт БТ пра яго калонію (фота)

"Кніга ў зняволенні – гэта больш чым кніга": што чытаюць беларусы ў СІЗА і калоніях?



ГАЛОЎНАЕ

Памёр палітзняволены мастак Алесь Пушкін дапоўнена







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Гэта бессэнсоўны акт прапаганды". Былы палітвязень ПК-17 пра сюжэт БТ пра яго калонію (фота)

"Як часціцу беларускай душы вырвалі кіпцюрамі": міжнародная супольнасць і беларусы ў свеце рэагуюць на смерць Алеся Пушкіна

Жыхарку Жлобіна апазналі па кашулі і асудзілі за ўдзел у жнівеньскай акцыі пратэсту 2020 года

Юрыст "Вясны" Павел Сапелка пракаментаваў умовы разгляду справы Юргілевіч і Мажэйкі

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

"Рэжымныя аб'екты — залатое дно". Былы палітвязень і юрыст "Вясны" — пра прамзону ў калоніі № 17

Ліквідацыя апазіцыйных партый, папаўненне ў спісе "экстрэмісцкіх" матэрыялаў: хроніка пераследу 11 ліпеня (дапоўнена)

У Гомелі за абразу Лукашэнкі асудзілі былога іераманаха

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень

2023







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO





















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY